# ВЯСЕЛЛЕ З ПРЫСМАКАМ НАСТАЛЬГІІ

*У мінулую суботу адбылася падзея, якую ў маёй сям'і чакалі паўгода. Акурат на Макавей, як называюць у народзе Мядовы Спас, мая сяброўка Даша выйшла замуж. Нягледзячы на тое што ў бацькоў нас двое — я і старэйшы брат, адчуванне было менавіта такое, што аддаю замуж родную сястру.*

*З Дашай мы нарадзіліся ў адзін месяц, толькі з розніцай у год. З'явіліся на свет у адной вёсцы, жылі ў адным доме, хоць і на розных паверхах, хадзілі ў адзін дзіцячы садок. Дагэтуль памятаю, як, узяўшыся за рукі, ехалі цёмнымі зімовымі раніцамі на санках — менавіта так у заснежанае надвор'е ў вёсках дастаўляюць у дашкольныя ўстановы дзяцей бацькі. Везлі нас чамусьці таты: ім, сябрам, па дарозе на работу заўжды было аб чым пагаварыць.*

*У садку працавала Дашына мама. Яе, таленавітага музыку, любілі ўсе ў нашай вёсцы. Не выключэннем былі і мы, дзеці. Галіна Генрыхаўна вучыла нас «патрапляць» у ноты, запамінаць звычайныя дзіцячыя матывы, знаёміла з музычнымі інструментамі. А яшчэ яна вучыла нас плаваць: увіце сабе, у нашым вясковым садку быў самы сапраўдны басейн! Успамінаюцца святочныя ранішнікі, іншыя мерапрыемствы, якія яна ўмела арганізаваць, у тым ліку і на гэтай вадзе.*

*З яе дачкой мы разам скончылі дзіцячы садок і, удосталь нагуляўшыся на канікулах перад школай, узяліся за ручкі ды пайшлі ў першы клас. І як селі за адну парту, так і прасядзелі разам да 11 класа. У вучобе Даша была слабейшая за мяне, выдатніцу. Я заўжды імкнулася ёй дапамагчы, хоць іншым чамусьці вельмі не любіла даваць спісваць. Дапамагала сяброўцы рабіць урокі дома, вучыла асвойваць камп'ютар, які ў мяне з'явіўся раней. Яна ж, у сваю чаргу, выручала мяне на гуртках па культурнай самадзейнасці, на ўроках малявання і музыкі — за творчасць у нашым тандэме адказвала Даша.*

*Мы заўжды былі разам і пасля ўрокаў, на выхадных, падчас канікулаў. Помню, што я заўсёды адмаўлялася ехаць у дзіцячыя летнікі (тады — піянерскія лагеры), бо баялася, што без маёй сяброўкі мне будзе сумна. Мы разам хадзілі ў грыбы і ягады, па чарзе — то ў яе, то ў мяне — палолі на агародах грады, пяклі адна ў адной пірагі і пячэнне... Нашы бацькі заўжды ведалі, што калі дачкі няма дома, значыць, яна з сяброўкай. Помню, як у адзін з першых дзён новага года мы так загуляліся на пляцоўцы каля школы, што мая мама пайшла нас шукаць: быў моцны мароз, снегапад. Нам жа было цёпла: з сяброўкай мы будавалі са снегу дом. Не забуду, калі аднойчы я ўпала з веласіпеда і моцна параніла нагу, а мая Даша «лячыла» маю рану трыпутнікам. Ці як Даша падгаварыла мяне сапсаваць адзін з падарункаў нашага суседа на мой дзень нараджэння — майку. Я размалявала яе чорным фламастарам. А Дашын ручнік, які яна мне ў той дзень падарыла, вісіць і дагэтуль у маёй мінскай кватэры. Не забываюцца і першыя танцы, куды мы ішлі ў непрыгожых ботах (іншых не было), а таму пакідалі іх пад елкай каля клуба і пераабуваліся ў туфлі на абцасах.*

*А потым моцна захварэла Дашына мама. І на дыскатэкі я ўжо хадзіла без маёй сяброўкі. Мая Даша раптам не па гадах стала сталейшай за мяне. Пакуль цёця Галя ляжала ў бальніцах, яна рабіла ўсю хатнюю справу, палола ў агародзе, дапамагала бацьку з гаспадаркай, а часта, здаралася, глядзела і самога бацьку, які пачаў выпіваць. Галіна Генрыхаўна памерла, калі Дашы было 16 гадоў. Цвярозым дзядзьку Жэню мы сталі бачыць усё радзей. Клопату ў Дашы пабольшала, а тым часам яна заканчвала 11 клас — трэба было думаць выключна пра вучобу, а ёй, беднай дзяўчынцы, часта было не да гэтага. Чым магла, дапамагала сястра, якая жыла ў Мінску, сваякі сталі прыязджаць усё радзей. Мы бачылі гэта, і спрабавалі быць ёй карыснымі. Мая мама часта запрашала Дашу на абеды, нярэдка я прыходзіла да яе начаваць, як магла, дапамагала з вучобай.*

*Разам і паехалі ў Мінск. Я паступіла на журфак. Даша скончыла курсы цырульнікаў. Усё радзей яна стала прыязджаць у вёску. Па-першае, у выхадныя імкнулася падпрацоўваць, бо трэба было на нешта жыць. Па-другое, прыязджаць у паўпустую хату было для яе вельмі балюча. Раптоўна пайшоў з жыцця і яе бацька. Дзядзькі Жэні не стала — амаль не з'яўлялася ў вёсцы і Даша. Зрэдку прыязджала ў сваю кватэру, але для яе гэта было моцным выпрабаваннем, таму сяброўка заўжды заставалася нанач у маіх бацькоў.*

*Нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія выпалі на Дашын лёс, яна не зламалася. Былі перыяды, калі дзяўчыне не было дзе жыць, калі не хапала грошай на элементарныя рэчы. Аднак, як кажуць, свет не без добрых людзей — заўсёды былі побач тыя, хто ёй дапамагаў. Хапіла ёй і яе мэтанакіраванасці, стойкасці, цярплівасці, дзякуючы чаму яна стала добрым спецыялістам, прафесіяналам у сваёй справе. Сёння Даша — кваліфікаваны цырульнік, майстар самага высокага разраду. Каб трапіць да яе ў салон прыгажосці, людзі запісваюцца за месяц, а тое і больш, наперад. Нарэшце, пашанцавала ёй і ў асабістым жыцці. Вяселле было цудоўнае. Для мяне — са слязьмі на вачах, бо, упэўнена, яе бацькі ганарыліся б сваёй дачушкай.*

**Вераніка КАНЮТА.**

Сямейная газета

Выпуск № 15 (174)

Тыя, хто побач

## Алена АТРАШКЕВІЧ:

# «МУЖ НЕ ЧАКАЕ, ШТО Я БУДУ ІДЭАЛЬНАЙ ГАСПАДЫНЯЙ ДОМА»

**Кампазітар, педагог і першая жанчына-старшыня Саюза кампазітараў Беларусі Алена Атрашкевіч — абаяльная і самадастатковая. Вакол яе заўсёды шмат людзей — вучні, калегі: яна прыцягвае іх, нібы магніт.**



**Алена АТРАШКЕВІЧ з мужам Мікалаем.**

Калі мы сустрэліся, то пасмяяліся: у нас аказаліся аднолькавыя маскі. На жаль, ад тэмы ковіду сёння нікуды не падзецца. Алена Віктараўна сказала, што яе 89-гадовая маці прайшла курс вакцынацыі. «Мая вялікая радасць», называе яна сваю маму. У голасе столькі цяпла, захаплення, падзякі...

— Мая мама, Ганна Лявонцеўна, — чалавек неверагоднага лёсу. У 13 гадоў, у 1944 годзе, яна засталася круглай сіратой, — распавядае Алена Віктараўна. — Пры гэтым яна — адна з нешматлікіх дзяцей са сваёй вёскі, хто пазней закончыў 10 класаў. Старшыня калгаса даў ёй грошай на дарогу і сказаў: «Табе трэба далей вучыцца, едзь паступаць у Ленінград». І мама паехала. Можна ўявіць, якое ў яе было жыццё: і голад, і холад, і беднасць. Але ўспамінаючы той час, яна ніколі не скардзілася, маўляў, было цяжка. Яна казала пра тое, як заўсёды імкнулася да ведаў, як ёй было цікава працаваць, ставіць перад сабой мэты і дасягаць іх. Мае бацькі стараліся, каб у мяне і маёй старэйшай сястры Наташы было ўсё: дзіцячыя забавы, прыгожае адзенне. Убачыўшы ў сяброўкі піяніна, я таксама сказала бацькам, што хачу займацца музыкай, потым з'явілася цікавасць да малявання. І піяніна, і самыя лепшыя фарбы — усё гэта ў мяне было. У той жа час нельга сказаць, што мы былі распешчаныя. Улетку з сястрой спачатку дапамагалі сваякам па гаспадарцы, потым ужо і працавалі на канікулах. Бацькі ўмелі знайсці нейкую залатую сярэдзіну ў выхаванні. Яшчэ мне вельмі падабалася, што нас ніколі не лаялі за розныя выбрыкі, а спакойна размаўлялі, разбіраліся, да чаго тое можа прывесці.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Я — школьнік

# ВЕДЫ — ПЛЮС, ПЕРАГРУЗКА — МІНУС

## Сакрэты паспяховай адаптацыі першакласніка

**Хутка надыдзе той чароўны дзень, калі самы старэйшы дашкольнік стане самым малодшым школьнікам — першакласнікам. Для новаспечанага вучня і для яго бацькоў гэта не толькі хвалюючая падзея, але і прыкмета будучых выпрабаванняў. У школе першакласніка падсцерагаюць дакладны распарадак і строгая дысцыпліна. Ад дзіцяці чакаюць хуткага пераходу ад гульнявой да вучэбнай, пазнавальнай дзейнасці. Вакол малога з'яўляецца шмат новых людзей, як сярод дарослых, так і сярод дзяцей, з якімі неабходна ўсталёўваць сувязі. Да такіх перамен першакласніку прывыкнуць няпроста, таму на дапамогу лепш прыйсці дарослым. Пра тое, як гэта зрабіць і на што звярнуць увагу, бацькам расказала псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольга ВАРАНЬКО.**



### Шукаць настаўніка, а не школу

— Бацькі звычайна разумеюць і ведаюць, як іх дзіця ўзаемадзейнічае з іншымі малымі, як рэагуе на крытыку дарослага, абзыванні дзяцей, як яно пачынае зносіны, ці ідзе першае на кантакт, — тлумачыць спецыяліст. — Таму пры ўладкаванні свайго малога ў школу трэба больш звяртаць увагу не на прэстыж установы, а на рэпутацыю настаўніка. Справа ў тым, што менавіта настаўнік вызначае мікраклімат у класе. У пачатковай школе першы настаўнік — арыенцір. На жаль, і сёння можна даведацца пра тое, што педагог вылучае якіх-небудзь вучняў, напрыклад, па добрай паспяховасці, ці, наадварот, адасабляе дзяцей за «дрэнныя паводзіны». Такія рэчы вызначаюць міжасабовыя зносіны ў класе.

Калі ж настаўнік знойдзены, бацькі могуць сустрэцца з ім загадзя і расказаць пра асаблівасці наладжвання кантакту са сваім дзіцем. Калі ж не атрымалася, хвалявацца не трэба: у першым класе праз некалькі месяцаў псіхолагам школы праводзіцца дыягностыка адаптацыі. Адным з крытэрыяў з'яўляецца дабрабыт, камфортнасць знаходжання ў класным калектыве. Гэта не закрытая інфармацыя, таму бацькі могуць пацікавіцца вынікамі і, калі патрэбна, своечасова зрэагаваць на праблему.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*